**Г. М. КАНЦАВАЯ**
БрДУ імя А. С. Пушкіна

# ПРАЦА З ТЭКСТАМ НА І СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ Ў МЕЖАХ ТЭХНАЛОГІІ АКТЫЎНАГА ЧЫТАННЯ

Тэхналогія актыўнага чытання заснавана на прынцыпе суб'ектыўнасці ў навучанні і валодае ўсімі прыметамі сістэмы (логікай працэсу, узаемасувяззю ўсіх яго частак, цэласнасцю). У ёй выдзяляецца 3 групы задач: пазнавальныя (асэнсаванне зместу тэксту), камунікатыўныя (фарміраванне навыкаў працы ў групе), сацыяльныя (фарміраванне якасцяў грамадзяніна, неабходных для сацыялізацыі асобы ў грамадстве).

Урокі, пабудаваныя па мадэлі актыўнага чытання, накіраваны на фарміраванне ў малодшых школьнікаў абагульненых ведаў, уменняў і навыкаў, а таксама спосабаў мыслення, умення працаваць у групе, графічна афармляць тэкставы матэрыял, творча інтэрпрэтаваць інфармацыю, ранжыраваць яе па ступені навізны і значымасці.

Тэхналогія актыўнага чытання, ці пазіцыйнага навучання, уключае некалькі этапаў: *падрыхтоўчы* (падрыхтоўка настаўнікам матэрыялу, распрацоўка заданняў для групавой працы, падрыхтоўка да кіравання групавой дыскусіяй); *арганізацыйны* (падзел вучняў на групы, размеркаванне пазіцыйных роляў), *актыўнае* (пазіцыйнае ) *чытанне* (група вывучае тэкст з пункту погляду сваёй пазіцыйнай ролі і распрацоўвае змест і спосабы дэманстрацыі сваёй пазіцыі), *прэзентацыя і «абарона» пазіцыі, адказы на пытанні аднакласнікаў і настаўніка* [1].

Асноўная ідэя тэхналогіі – абдумаць, распрацаваць, патлумачыць і абараніць абраныя пазіцыі на аснове вучэбнага тэксту.

На кожным з этапаў праца вядзецца з пункту погляду адной з пазіцый. У пачатковай школе ў залежнасці ад мэт і зместу ўрока аптымальным з'яўляецца спіс з 4–6 пазіцый.

Разгледзім найбольш актуальныя пазіцыі для пабудовы ўрока на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі ў адпаведнасці з мадэллю пазіцыйнага навучання: *«паняцце»* – вызначыць асноўныя паняцці тэксту і даць ім азначэнні (з выкарыстаннем слоўнікаў); *«схема»* – даць схему, якая паказвае сэнсавыя сувязі паміж адзінкамі вывучаемага матэрыялу, і зрабіць да іх тлумачэнні; *«тэзіс»* – выдзеліць і абгрунтаваць асноўныя тэзісы тэксту, у сціслай форме перадаць змест прапанаванага тэксту; *«апалагет»* – паказаць пазітыўнае значэнне тэксту, падтрымаць ідэі аўтара; *«пытанне»* – сфармуляваць пытанні па змесце вучэбнага матэрыялу; *«рэфлексія»* – вызначыць цяжкасці, якія могуць узнікнуць у вучня пры выкарыстанні

матэрыялу; *«эксперт»* – сфармуляваць станоўчыя і адмоўныя моманты ў дзейнасці кожнай групы; *«асацыяцыя»* – назваць асацыяцыі, якія выклікае тэкст (зрокавыя вобразы, дзіцячыя ўспаміны, музычныя вобразы); *«сімвал»* – выразіць ідэю тэксту з дапамогай зрокавага вобраза, прадставіць сімвал тэксту; *«паэзія»* – данесці змест тэксту ў вершаванай форме; *«тэатр»* – данесці змест сродкамі тэатра (мініяцюра, сцэнка).

Настаўніку неабходна паказаць вучням шлях, па якім ім неабходна рухацца, дапамагчы выразіць сваю думку. Галоўнымі крытэрыямі адбору прыёмаў працы з тэкстам становяцца такія, як універсальнасць, адкрытасць, якая дае магчымасць выразіць сваю думку (пазіцыю), прастата выкарыстання і асабістая зацікаўленасць вучняў – іх жаданне выканаць зданне, таму што «яно цікавае, хочацца выканаць паспяхова», а не толькі па ўказанні настаўніка.

У школьнай практыцы выкарыстоўваюцца разнастайныя метады і прыёмы працы з тэкстам на ўроках у пачатковых класах. Вылучым найбольш эфектыўныя з іх у межах тэхналогіі актыўнага чытання: традыцыйныя прыёмы (вызначыць тэму тэксту, падабраць загаловак, знайсці ключавыя словы, скласці план і г. д.), гульнявыя («Колькі літар у незразумелым слове?», «Дыяфільм», «Выпраў памылку», «Зашыфруй» і інш.), прыёмы тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення («Кубік Блума», «Шэсць капелюшоў мыслення» і г. д.).

Аднак перш чым уводзіць у адукацыйны працэс тэхналогію актыўнага чытання, малодшых школьнікаў неабходна навучыць прыёмам працы з тэкстам. На працягу 1–2 класаў дзеці вучацца вызначаць тэму тэксту, галоўную думку, падбіраць загаловак да тэксту, складаць план. На ўроках настаўнікам ствараюцца ўмовы для знаёмства вучняў з асаблівасцямі пазіцый («тэзіс», «пытанне», «схема» і г. д.), вядзецца праца па далучэнні вучняў да групавой вучэбнай дзейнасці. Пачынаючы з 3 класа вучням прапануецца аналізаваць тэкст, выбіраючы пэўную пазіцыю.

У 4 класе аналіз тэксту з пэўнай пазіцыі ўжо знаёмы ўсім вучням, прыёмы працы ўдасканальваюцца, адбываецца авалоданне гэтым уменнем. На ўроках малодшыя школьнікі вучацца абараняць свае пазіцыі, адстойваць меркаванне сваёй групы, параўноўваць вынік з запланаваным.

Асаблівая роля тэхналогіі актыўнага чытання адводзіцца пры падрыхтоўцы вучняў да працы з інфармацыяй:

– *атрыманне, пошук і фіксацыя інфармацыі* (успрымаць на слых і разумець розныя інфармацыйныя віды паведамленняў; усвядомлена чытаць тэксты з мэтай набыцця чытацкага вопыту, асваення і выкарыстання інфармацыі; усведамляць мэту чытання і выбіраць у адпаведнасці з ёй патрэбны від чытання (азнаямляльнае, вывучальнае, пошукавае); арыентавацца ў слоўніках і даведніках);

– *разуменне іператварэнне інфармацыі* (дзяліць тэкст на сэнсавыя часткі, складаць просты план тэксту, падрабязна і сцісла вусна пераказваць прачытаны ці праслуханы тэкст; вычляняць змешчаныя ў тэксце асноўныя падзеі і ўстанаўліваць іх паслядоўнасць; знаходзіць інфармацыю, пададзеную ў яўным і ў няяўным выглядзе; інтэрпрэтаваць і абагульняць інфармацыю; ператвараць інфармацыю);

– *выкарыстанне і прадстаўленне інфармацыі* (удзельнічаць у дыялогу пры абмеркаванні прачытанага тэксту; выкарыстоўваць атрыманы чытацкі вопыт для ўзбагачэння пачуццёвага вопыту, выказваць ацэначныя меркаванні і свой пункт погляду аб прачытаным тэксце; складаць вусна невялікае маналагічнае выказванне па прапанаванай тэме; выступаць перад класам з невялікімі паведамленнямі);

– *ацэнка дакладнасці атрыманай інфармацыі* (на аснове назапашаных ведаў знаходзіць недакладнасць у атрыманай інфармацыі; у працэсе працы з крыніцамі выяўляць змешчаную ў іх супярэчлівую інфармацыю).

Для разумення малодшымі школьнікамі сэнсу тэксту можна прапанаваць наступныя практыкаванні: складанне схем, табліц; ацэнка зместу тэксту; фармуляванне пытанняў да тэксту; слоўнікавая праца; падзел тэксту на часткі, складанне плана; вызначэнне тэмы тэксту, галоўнай думкі; падбор ілюстрацыі да тэксту; складанне дыяфільма; выбарачнае чытанне; праца па пытаннях настаўніка, падручніка ці вучня; чытанне з мэтай падрыхтоўкі да пераказу; узнаўленне лагічнай паслядоўнасці тэксту; пашырэнне тэксту (у 1–2 класах па пытаннях настаўніка, а ў 3–4 – самастойна); фантаграмы (у знаёмым тэксце мяняецца адна ўмова (герой, пара года, месца дзеяння і г. д.), а вучні фантазіруюць, як зменіцца змест; прыдумваюць працяг апавядання); складанне крыжаванак па тэксце; віктарыны па творах; падбор загадак да слоў з тэксту; складанне загадак; падбор прыказак і прымавак, якія раскрываюць тэму тэксту; складанне рэбусаў да слоў з тэксту і інш.

Урокі з выкарыстаннем тэхналогіі актыўнага чытання з’яўляюцца запамінальнымі, цікавымі і для вучняў, і для настаўніка, так як вучні ствараюць актуальную творчую распрацоўку, а настаўнік арганізуе эфектыўнае засваенне вучэбнага матэрыялу. Такія ўрокі садзейнічаюць авалоданню малодшымі школьнікамі навыкамі эфектыўнай працы з тэкстам, фарміраванню навыкаў рэфлексіі, развіццю творчых здольнасцяў, удасканаленню навыкаў камунікацыі, паглыбленню пазнавальных матываў навучання, павышэнню самаацэнкі вучняў.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Налапкина, Н. В. Модель позиционного обучения как средство формирования универсальных учебных действий в начальной школе [Электронный ресурс] /

Н. В. Налапкина. – Режим доступа: http://my-vmeste.ucoz.net/index/tekhnologija_pozicionnogo_chtenija/0-7. – Дата доступа: 10.05.2020.